Рэспубліканская акцыя **«Вандруй. Адчуй. Натхняйся»** штогод набірае папулярнасць.

Увесь мінулы тыдзень у нашай краіне праходзіла **рэспубліканская акцыя** «Вандруй. Адчуй. Натхняйся», галоўная мэта якой — **папулярызацыя** ўнутранага **турызму** Рэспублікі Беларусь.

# Цікава і дома



Экскурсію праводзіць Ніна Ярмух.

З задавальненнем далучыліся да мерапрыемства і палачане: гасцінныя, гатовыя прадставіць турыстычны патэнцыял сваёй установы ці аграэкасядзібы, і жадаючыя даведацца пра нешта новае, з карысцю правесці вольны час.

Акцыя ў нашым горадзе распачалася бясплатнай экскурсіяй па комплексе былога Полацкага калегіума, якую арганізаваў турыстычны цэнтр ПДУ імя Еўфрасінні Полацкай. Жадаючых пабываць у вышэйшай навучальнай установе знайшлося больш за 50. Прыйшлі моладзь і пенсіянеры, бацькі з дзецьмі. Нікога не пакінула раўнадушным міні-экскурсія «Гутарка з механічнай галавой і ўніверсітэцкі дворык», якую правяла супрацоўнік турцэнтра Марына Бурлакова.

Пераняў эстафету Полацкі раённы Цэнтр рамёстваў і нацыянальных культур. Сюды на экскурсію прыйшлі жанчыны, каб даведацца пра беларускую спадчыну на прэзентацыі выставы «Народныя промыслы — багацце культуры» і пазнаёміцца з творчым праектам «Полацкі абярэг». З экскурсаводам Нінай Ярмух, кіраўніком народнага клуба лапікавага шыцця «Рошва», яны здзейснілі падарожжа з мінулага ў сучаснасць. Удзельніцы акцыі набылі новыя веды і захапіліся гісторыямі шматлікіх творчых прац «Полацкага абярэгу».

Акцыя працягвалася днямі адчыненых дзвярэй на аграэкасядзібах «Домік ля ракі», «Жураўна», «Канашы-агра» і Багатырскім сельскім Доме культуры. Іх гаспадары знаёмілі гасцей з інфраструктурай, забаўляльнымі праграмамі і частавалі. На сядзібе «Канашы-агра» Анатоль Радзько прапанаваў наведвальнікам пасправабаваць духмяную юшку з рыбы, злоўленай у возеры Канашы. А ў Полацку, у рэстаране «Гранд-паб», адбылася дэгустацыя стравы царскага меню ў межах экскурсійнай праграмы «Раманавы ў Полацку».


Адзін з цікавых момантаў у ПДУ імя Еўфрасінні Полацкай.

Цікава, пазнавальна, незабыўна... Такія водгукі гучалі ад удзельнікаў акцыі пасля іх знаёмства з турыстычнымі аб'ектамі Полацка і Полацкага раёна. Выказвалася пажаданне, каб як мага больш палачан наведвалі экскурсіі ў родным горадзе, захапляліся ўбачаным і ганарыліся. *«Было б здорава, каб такая турыстычная акцыя мела мясцовы статус і праводзілася ў Полацку хаця б раз у квартал»*, — выказала прапанову Наталля Смяшко, якая з задавальненнем наведала экскурсію па цэнтры Полацка.

**Аліна БАЛЬШАКОВА (тэкст і фота).**

Больш за 20 чалавек — мясцовыя жыхары і госці Полацка — прыйшлі на дзённую бясплатную аглядную экскурсію па цэнтры старажытнага горада. Даведацца пра таямніцы помнікаў і гістарычных месцаў ім дапамагла экскурсавод Наталля Лабоха.

**Людміла КАРПУК, дырэктар турцэнтра «Полацк»:**
— Думка пра тое, што мы жывем у Полацку, усё пра яго ведаем і не трэба хадзіць на экскурсіі, самая памылковая. У акцыі «Вандруй. Адчуй. Натхняйся» быў задзейнічаны далёка не ўвесь турыстычны патэнцыял горада і раёна, ён значна шырэйшы, нездарма ў Полацк прыязджаюць шматлікія турысты. А палачанам нічога не перашкаджае наведваць цікавыя турыстычныя аб'екты ў Полацку, дома, для гэтага трэба мець толькі жаданне.


На экскурсіі дарослыя і дзеці.